# АБ ПАЧАТКАХ ДЗЕЙНАСЦІ МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БССР П.К. КРАЎЧАНКІ (1990 год)

**У. Е. Снапкоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, ulsnap44@inbox.ru*

Артыкул прысвечаны пачатку дзейнасці міністра замежных спраў Беларускай ССР П.К. Краўчанкі (ліпень–снежань 1990 год). Разглядаюцца грамадска-палітычныя і асабістыя передумовы і абставіны, якія садзейнічалі прыходу П. Краўчанкі ў дыпламатыю і абранню міністрам замежных спраў БССР 17 ліпеня 1990 г. Апісана сітуацыя ў беларускім МЗС і першыя крокі міністра, якія прывялі ў дзеянне новую беларускую дыпламатыю.

***Ключавыя словы***: Беларуская ССР; перабудова; Міністэрства замежных спраў; знешнепалітычная дзейнасць; дыпламатыя; Арганізацыя Аб’яднанннных Нацый.

# ABOUT THE BEGINNINGS OF THE ACTIVITIES OF THE MINISTER OF FOREIGN AFFAIRS OF THE BSSR P. K. KRAUCHANKA (1990)

**U. E. Snapkouski**

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, ulsnap44@inbox.ru*

The article is devoted to the beginning of the activities of the minister of foreign affairs of the Belarusian SSR P.K. Krauchanka (July-December 1990). The socio-political and personal preconditions and circumstances that contributed to P. Kravchenka's entry into diplomacy and his election as the minister of foreign affairs of the BSSR on July 17, 1990 are considered. The situation in the Belarusian Foreign Ministry and the first steps of the minister that put the new Belarusian diplomacy into action are described.

***Keywords*****:** Belarusian SSR; perestroika; Ministry of foreign affairs; foreign policy activity; diplomacy; United Nations Organization.

Пасля вяртання ў 1944 г. Беларускай ССР, як і іншым саюзным рэспублікам, знешнепалітычных паўнамоцтваў, Міністэрства замежных спраў у Мінску на працягу 46 год узначальвалі два чалавекі – К. В. Кісялёў (1944-1966 гг.) і А. Е. Гурыновіч (1966-1990 гг.). Іх дзейнасці і асаблівасцям дыпламатычнага стылю прысвечаны шэраг аўтарскіх публікацый [1; 2]. Трэцім у пaслеваенны час і апошнім міністрам замежных спраў БССР стаў Пётр Кузьміч Краўчанка, які ўзначальваў МЗС чатыры гады (ліпень

1990 г. – ліпень 1994 г.). Ён ж і адкрыў лік міністраў замежных спраў незалежнай Рэспублікі Беларусь, да атрымання незалежнасці якой меў самае непасрэднае дачыненне.

П. Краўчанка быў выбраны на пасаду міністра Вярхоўным Саветам БССР 17 ліпеня 1990 г. Выбарным шляхам гэта адбылося ўпершыню ў гісторыі Беларусі XX і пачатку XXI ст. і ў апошні раз. Ён быў дастаткова малады (40 гадоў), аднак меў за плячыма багаты, 10-гадовы вопыт партыйнага работніка і кіраўніка, папрацаваўшы ў Мінскім гаркаме і ЦК КПБ. У 1990 г. абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 12 склікання, аднак хутка развітаўся з дэпутацкім мандатам пасля абрання міністрам. У гады перабудовы аказаўся адзіным партыйным функцыянерам, хто вытрымаў жорсткія выпрабаванні вулічнай дэмакратыяй і трапіў у Вярхоўны Савет праз сіта народнага галасавання [3, с. 152-164]. У іншых інтэрв'ю, адказваючы на пытанні наконт хвалявання падчас выступленняў з высокай трыбуны Генеральнай Асамблеі ААН, міністр казаў, што канешне хваляваўся, але ўжо значна менш, чым на масавых мітынгах на вуліцах, плошчах, парках і завулках Мінска. Баявая загартоўка часоў перабудовы з'явілася для будучага міністра добрай школай палітычнай камунікацыі і публічнай дыпламатыі.

Другой адметнай асаблівасцю апошняга савецкага і першага постсавецкага міністра замежных спраў Беларусі было тое, што ён не быў прафісійным дыпламатам і не атрымаў дыпламатычнай адукацыі. П. Краўчанка закончыў гістарычны факультэт БДУ і марыў паступіць у Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін. Пытанне адпала, калі даведаўся, што для паступлення трэба членства ў КПСС. Калі працаваў у Мінскім гаркаме партыі, мог па разнарадцы паехаць вучыцца ў Дыпламатычную акадэмію МЗС СССР. Але туды не пусцілі, па яго ж словах, мудрыя партыйныя настаўнікі, перш за ўсё В. Ф. Кебіч, якія лічылі, што трэба застацца адпрацаваць і набрацца вопыту ў Мінску. Гэта было для яго псіхалагічным ударам [3, с. 165]. Так, дзякуючы В. Кебічу, П. Краўчанка тады не стаў дыпламатам. Пазней аднак прыйшло разуменне таго, што аб гэтым не трэба было шкадаваць. «После Дипакадемии меня отправили бы третьим секретарем посольства какой-нибудь забытую богом африканскую страну, где под сенью пальм я ностальгировал бы о далекой родине без всяких видов на служебное продвижение» [4, с. 32].

У нашай размове Пётр Кузьміч сфармуляваў квінтэсенцыю ўзыходжання на вышэйшыя прыступкі дыпламатычнай лесвіцы, што вынікала з яго жыццёвага вопыту. Яна гучала такім чынам: «Але праз гады зразумеў: тое, што я не стаў кар'ерным дыпламатам, – падарунак лёсу. Стаўшы міністрам замежных спраў, я змог пераадолець усе

застарэлыя формы і метады традыцыйнай савецкай дыпламатыі. Я не быў звязаны кланавай і партыйнай салідарнасцю, бо мяне абіраў першы дэмакратычны парламент, а не прызначала Палітбюро. Я нікому нічым не быў абавязаны. Абапіраўся на досвед даследчай працы, на партыйную загартоўку». Адзначым, што яго папярэднікі (К. Кісялёў і А. Гурыновіч) таксама МДІМА не заканчвалі, прайшоўшы курсы Вышэйшай дыпламатычнай школы МЗС СССР. Але яны былі і засталіся дыпламатамі савецкай школы, што было асабліва характэрна для А.Гурыновіча, які ўвасабляў яе кансерватыўна-ахоўны кірунак [5, с. 206-207] .

Як вядома, у савецкай і заходняй дыпламатыі былі неаднаразовыя прыклады таго, як кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў і тым больш пасламі станавіліся людзі па прызначэнні, без спецыяльнай адукацыі, якія пазней пакідалі яркі след у гісторыі міжнародных адносін. Сярод такіх асоб аказаўся П. Краўчанка. Ён прызнае і пэўныя мінусы з адсутнасці дыпламатычнай адукацыі, якія ў значнай ступені нівеліраваліся гістарычнай адукацыяй БДУ і ступенню кандыдата гістарычных навук у галіне гісторыі замежных сувязей БССР 1920-х – пачатку 1930-х гг. Недахоп спецыяльных ведаў па праблемах міжнароднай бяспекі і раззбраення выпраўляўся кансультацыямі і парадамі з боку супрацоўнікаў беларускага МЗС і масцітых савецкіх дыпламатаў (У. Ф. Пятроўскага, Ю. М. Варанцова, А. М. Беланогава).

У выступленні перад дэпутатамі П. Краўчанка паказаў разуменне дзяржаўных інтарэсаў і гатоўнасць іх адстойваць, асабліва па справах, звязаных з чарнобыльскай катастрофай. Ён нават заявіў аб намерах звярнуцца ў Міжнародны суд у Гаазе з пазовам да саюзнага Міністэрства атамнай энергетыкі, адказнага за развіццё ядзернай энергетыкі ў краіне і за тое, што адбылося на ЧАЭС [6, с. 369]. Але першым меркаваннем прынцыповага характару была ацэнка тагачаснай дзейнасці МЗС БССР: «па сваёй сутнасці яно ў сілу аб'ектыўных прычын (і гэта не віна нашых дыпламатаў) так і не стала МЗС у поўным сэнсе гэтага слова» [6, с. 368]. Вынікі тайнага галасавання прадэманстравалі вялікі крэдыт даверу да палітыка, бо з 340 дэпутатаў толькі дзесяць прагаласавалі супраць.

Так партыйны функцыянер з рэдкім для гэтай катэгорыі наменклатуры дарам валодання беларускай мовай, стаў міністрам замежных спраў. Ва ўмовах перабудовы, нацыянальнага адраджэння, дэмакратызацыі грамадскага і палітычнага жыцця СССР і саюзных рэспублік, умацавання самастойнасці МЗС БССР, якое ўжо магло абаперціся на толькі што прынятую Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі, П. Краўчанка аказаўся запатрабаваным часам перамен і плыннай гісторыяй нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва.

Вяртаючыся да майго пытання аб тым, што не прайшоў традыцыйны шлях савецкага дыпламата, вымушанага падпарадкоўвацца карпаратыўным інтарэсам і жорсткай субардынацыі, міністр адзначае, што той час імклівых і радыкальных змен у палітыцы і грамадскіх настоях патрабаваў новых людзей. Перабудова дала шанс П. Краўчанку здзейсніць сваю мару пра дыпламатычны шлях, прытым адразу з пасады кіраўніка МЗС. Адчуваючы набліжэнне і верагоднасць гэтага шансу, ён адмовіўся ад прапановы прэм’ер-міністра В. Кебіча заняць пасаду яго намесніка і нават першага віце-прэм’ера, чым яго моцна раззлаваў. Калі П. Краўчанка сказаў пра сваю мару стаць міністрам замежных спраў, стары і вопытны наменклатуршчык В.Кебіч у некалькіх рэзкіх сказах апісаў, чым было МЗС у вачах і думках рэспубліканскага партыйнага кіраўніцтва. «Ты же знаешь, что никакого Министерства иностранных дел у нас нет... На самом деле это просто синекура, несколько чиновников просиживают штаны, средь бела дня играя в шахматы. ... Это же не министерство, а управленческий аппендикс!.. Тихая гавань...» [4, с. 27]. Размова была ўвёсну 1990 г., калі ў выніку размоў з В. Кебічам былі дасягнуты так званыя “бярэзінскія пагадненні”. П. Краўчанка адказаў: «Через год МИД будет одним из самых важных и беспокойных ведомств в республике. Это не тихая гавань, а главный инструмент политического назначения!» [4, с. 28]. Гэта абяцанне і рэалістычны прагноз хутка спраўдзіліся, калі новы і малады міністр удыхнуў свежае паветра ў працу знешнепалітычнага ведамства, якое пайшло ў авангардзе гістарычнага пераходу рэспублікі ад фармальнага суверэнітэту да рэальнай незалежнасці.

П. Краўчанка, успамінаючы пра сваё прадстаўленне калектыву МЗС з боку В. Кебіча, згадвае пра «халоднае, грабовае маўчанне» супрацоўнікаў міністэрства [4, с. 44]. Пры перадачы спраў былы міністр А. Гурыновіч пакінуў яму ў сейфе адзіны дакумент – палажэнне аб Міністэрстве замежных спраў БССР, зацверджанае ў 1988 г. Нейкіх сакрэтных матэрыялаў ці дасье ў сейфе міністра не было, і па словах П. Краўчанкі, ніколі не магло быць. Пазбягаючы негатыўнай ацэнкі дзейнасці асабіста А. Гурыновіча, якога новы міністр узяў да сябе саветнікам, П. Краўчанка паўтарае тэзіс аб тым, што «белорусского МИДа действительно не существовало. Все вопросы внешней политики решались в Москве» [4, с. 45].

Такое шчырае і разам з тым крыўднае для БССР і напэўна для УССР, хаця для апошняй у меншай ступені, прызнанне мог зрабіць толькі палітык, які прыйшоў у дыпламатыю звонку і кім сапраўды быў П. Краўчанка. Што датычыла супрацоўнікаў МЗС, то гэты быў даўно ўсталяваны і непахісны парадак рэчаў. Думкі міністра супадалі з

аўтарскімі падыходамі. У нашых публікацыях з пачатку 1990-х гг. праводзілася думка пра тое, што ў Беларускай ССР, як і ва УССР, не было сваёй «знешняй палітыкі», замест якой існаваў тэрмін «знешнепалітычная дзейнасць рэспублікі», замацаваны ў Канстытуцыі БССР 1978 г. Тое ж самае можна сказаць і пра дыпламатыю. У савецкі час, па меншай меры да 1990 г., не было «дыпламатыі Беларусі» як тэрміналагічнага паняцця і рэальнай з’явы, а замест іх быў выпрацаваны тэрмін «рэспубліканскі (беларускі) атрад савецкай дыпламатыі» ці савецкай дыпламатычнай службы [7].

П. Краўчанка, бяручы ў двукоссі тэрмін «знешняя палітыка» савецкай Беларусі, адзначае, што яна абмяжоўвалася выключна членствам у ААН, дзе аднак дэлегацыі БССР і УССР разглядаліся як прысцяжныя да дэлегацыі СССР. Роля беларускай дэлегацыі заключалася ў тым, каб празандзіраваць пазіцыю ЗША, паколькі яна па алфавітным спісе выступала на Генеральнай Асамблеі адной з першых. Прааналізаваўшы рэакцыю США і іншых дзяржаў, савецкая дэлегацыя магла падрыхтаваць больш аргументаваную пазіцыю. «фактар і лозунгі антыімперыялістычнай барацьбы, актыўна працавалі з дыпламатамі афра-азіяцкіх краін, у той час як саюзная дэлегацыя займалася «больш сур’ёзнымі» пытаннямі міжнароднай бяспекі ці правоў чалавека [4, с. 45].

Напаўненне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце канкрэтным зместам, матэрыялізацыя артыкулаў, якія адносіліся да знешнепалітычных і абаронных пытанняў, ажыццяўлялася павольна і непаслядоўна. Тым не менш рэспубліканскае МЗС ужо нацэльвалася на вылучэнне адважных ініцыятыў на міжнароднай арэне і азнаямленне сусветнай супольнасці з прыярытэтамі знешнепалітычнай дзейнасці, якія адпавядалі нацыянальным патрэбам і інтарэсам рэспублікі. З прыходам новага міністра трансфармаваліся формы і змест, стыль і метады працы беларускага МЗС, усёй знешнепалітычнай дзейнасці БССР. Цягам першых месяцаў работы новы міністр рэарганізаваў працу МЗС БССР: былі ўведзены новыя прынцыпы планавання дзейнасці, увайшла ў практыку справаздачная дзейнасць супрацоўнікаў [3, с. 172-175]. Урад і МЗС БССР у якасці стратэгічных мэтаў удзелу ў 45-й сесіі Генеральнай Асамблеі вызначылі прыняцце адмысловай рэзалюцыі ААН, прысвечанай аварыі на Чарнобыльскай АЭС, і вылучэнне ініцыятывы аб стварэнні бяз'ядзернай зоны ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе.

Свой дыпламатычны дэбют на 45-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (верасень–снежань 1990 г.) міністр замежных спраў БССР П. Краўчанка азнаменаваў дзвюма буйнымі ініцыятывамі (чарнобыльскай і аб бяз'ядзернай зоне ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе)

[8]. У кастрычніку ён вярнуўся ў Мінск, каб правесці складаныя перагаворы з польскім міністрам замежных спраў К. Скубішэўскім, на якіх паставіў смелыя і нечаканыя для Варшавы пытанні аб беларуска-польскай мяжы і становішчы беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы [6, с. 220–225].

Беларускі МЗС рашуча выходзіў з ценю саюзнага міністэрства і нават крыху апярэджваў у дыпламатычным пазіцыянаванні сваіх украінскіх калег. За паўгады дзейнасці новага міністра Беларуская ССР значна паскорыла свой рух на шляху ўмацавання рэальнага суверэнітэта ў галіне міжнародных адносін. Беларускі адрад савецкай дыпламатыі ператвараўся ў дыпламатычную службу новай незалежнай дзяржавы.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Снапкоўскі У. Е.* Дыпламатычны партрэт міністра замежных спраў Беларускай ССР А. Е. Гурыновіча: уражанні і роздумы // Дипломатия Беларуси: новые вызовы [Электронный ресурс] : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 24 марта 2022 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Е. А. Достанко (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2022. С. 43–51. URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/282356 (дата звароту: 05.03.2023).

2. *Снапкоўскі У. Е.* О дипломатическом мастерстве и стиле министра иностранных дел Белорусской ССР К. В. Киселева // Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце: материалы XX Междунар. науч. конф., посвящ. 100-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 29 октября 2021 г. / редкол.: Е. А. Достанко (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2021. С. 64–73. URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/276681 (дата звароту: 05.03.2023).

3. *Медельцов А. Ф.* Петр Кравченко. Человек, политик, дипломат. В 2 кн. Кн. 1. Восхождение. Минск: Редакция журнала «Дело (Восток+Запад)», 2020.

4. *Кравченко П. К.* Беларусь на распутье, или Правда о Беловежском соглашении. Записки дипломата и политика. М.: Время, 2006.

5. *Снапкоўскі У. Е.* Халодная вайна і новае мысленне ў лёсе міністра замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіча // Актуальные проблемы международных отношений и дипломатии: Материалы VI международной научно-практической конференции, Витебск, 19–20 мая 2022 г. / Витебский гос.ун-т; редкол.: А.П.Косов (гл. ред) [и др.]. Витебск, 2022. С. 202–207.

6. *Кравченко П. К.* Беларусь на переломе: дипломатический прорыв в мир: выступления, статьи, интервью, беседы, дипломатические документы и переписка. Минск : БИП-С Плюс. 2009.

7. *Снапковский В. Е.* Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии. Минск: Право и экономика, 2021.

8. Белоруссия и Чернобыль: К итогам деятельности делегации БССР на 45-й сессии Генеральной Ассамблеи ООН. Минск: Беларусь, 1991.